# ДА 70-ГОДДЗЯ
# УЛАДЗІМІРА ВАЛЯР'ЯНАВІЧА РУЛЯ



**Дарагі Уладзімір Валяр'янавіч!**

…Усё больш лісткоў аблятае з календара жыцця. Але для Вас кожны пражыты год – гэта крок да вечных ісцін і гармоніі, прасвятлення і прымірэння. Мы ведаем Вас як самабытнага беларускага паэта і не толькі. Нездарма літаратурная творчасць бачыцца Вамі высокай грамадскай трыбунай, чароўным ключом да сэрцаў людскіх. Вы без астатку аддаеце сябе захаванню і прымнажэнню культурнай спадчыны, нястомна складаеце гімны роднай мове, старонкам гісторыі, вобразам простых людзей, сучаснікаў, землякоў. Вам уласцівыя высакароднасць і чысціня намераў, мужная рашучасць і рамантычная вытанчанасць мастака. Гэтыя якасці дапамагаюць Вам заставацца сапраўдным творцам, верным сабе і Айчыне. Сардэчна віншуем Вас, дарагі сябра і калега. Здароўя Вам, новых здзяйсненняў, дабрабыту і міру ў душы. Няхай жыццё гучыць кранальнай, мілагучнай песняй… **З ЮБІЛЕЕМ!**

**Калектыў**
**Гродзенскага абласнога аддзялення**
**Саюза пісьменнікаў Беларусі**

***3 верасня 2023 года***
*Гродна – Нача*

